УДК 343.352(47)(091)

# ЗАРАДЖЭННЕ КАРУПЦЫІ НА ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКІХ ЗЕМЛЯХ У ЧАСЫ КІЕЎСКАЙ РУСІ

**В. М. Лянцэвіч**
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт,
дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі права,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**А. Д. Воінава**
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт,
студэнт факультэта права

***Анатацыя.*** *Артыкул прысвечаны даследаванню зараджэння карупцыі на ўсходнеславянскіх землях у перыяд Кіеўскай Русі (IX–XIII ст.) для выяўлення прычын з'яўлення гэтага негатыўнага феномена.*

***Ключавыя словы:*** *карупцыя, зараджэнне карупцыі, злоўжыванне паўнамоцтвамі, «кармленне», «абяцанне», ліхаімства, паднашэнне, гістарычны падыход.*

***Annotation:*** *The article is devoted to the study of the emergence of corruption in East Slavic lands during the period of Kievan Rus (9th–13th centuries) with the aim of identifying the causes of this negative phenomenon.*

***Keywords:*** *corruption, the origin of corruption, abuse of power, «feeding», «promising», malice, offering, historical approach.*

Даследаванне гістарычных вытокаў карупцыі на Беларусі і яе ўплыву на дзяржаўнае кіраванне адыгрывае важную ролю ў вывучэнні дадзенай з'явы. Разгляд ранніх формаў злоўжыванняў уладай дазваляе лепш зразумець іх эвалюцыю і сучасныя паралелі, што, у сваю чаргу, спрыяе аналізу механізмаў барацьбы з карупцыяй і фарміраванню празрыстых дзяржаўных інстытутаў.

Полацкая і Тураўская землі, асноўныя складнікі раннефеадальнай дзяржаўнасці на беларускіх землях, з X ст. з'яўляліся часткамі адносна цэнтралізаванай старажытнарускай дзяржавы з цэнтрам у Кіеве, якая фарміравалася на працягу IX–X стст., аб'ядноўваючы саюзы ўсходнеславянскіх плямёнаў пад уладай кіеўскага князя. Кіраванне дзяржавай было засяроджана ў руках князя, а таксама яго дружыны. Рэгуляванне паўнамоцтваў князя насіла звычаёвы характар і не замацоўвалася пісьмова. Пры гэтым ў раннефеадальны перыяд не прасочваецца падзел улады, што, у сваю чаргу, прыводзіла да злоўжыванняў прыбліжаных да князя мужоў.

Пачаткам карупцыйных праяў у апараце кіравання кіеўскага князя можна лічыць *палюддзе* — форму збору даніны з падуладных зямель. Калі восенню 945 г. кіеўскі князь Ігар (каля 878–945) па патрабаванні дружыны,

незадаволенай сваім станам, накіраваўся за данінай да драўлян «и при спе осень, нача мыслити на деревляны, хо тя примыслити большюю дань», «в се же лето рекоша дружина Игореви: “Отроци Свеньлъжи изоделися суть оружьемъ и порты, а мы нази. Поиди, княже, с нами в дань, да и ты добудеши, и мы”» [1]. Адпусціўшы астатніх дадому, князь з малой часткай дружыны вярнуўся, жадаючы ўзбагаціцца яшчэ больш. Драўляне, даведаўшыся аб тым, што Ігар вяртаецца, вырашылі яго забіць. Такім чынам, за князем была замацавана рэпутацыя «першага карупцыянера» на Русі, а дзеянні драўлян могуць разглядацца як спроба супрацьдзейнічаць праяве карупцыі і злоўжыванню ўладай [2, с. 392–393].

У Кіеўскай Русі (IX–XIII стст.) першапачатковымі з’яўляліся тры формы карупцыі: ушанаванне, аплата паслуг, а таксама «абяцанне». Паднашэнне ў выглядзе *ўшанавання* давалася для дэманстрацыі павагі таму, хто быў яе варты. Значэнне «ўшанавання» закладзена ў старажытных славянскіх звычаях адорваць паважанага чалавека, высокае начальства. Паступова «ўшанаванне» стала ўсё больш успрымацца як «дазволены хабар».

Асаблівая форма праявы карупцыі — *«абяцанне»*. Дадзенай формай выражалася плата за спрыяльнае вырашэнне спраў; за вынік здзяйснення пэўных дзеянняў чыноўнікам. «Абяцанне» праяўлялася ў пераплаце за паслугі, за вядзенне і афармленне спраў. Па гэтай прычыне розніца паміж дзвюма апошнімі формамі карупцыі заставалася практычна неадрознай.

Іншая форма карупцыі ў выглядзе *паднашэння* чыноўнікам была звязана з выдаткамі на само вядзенне і афармленне спраў. Гэтыя даходы, атрыманыя чыноўнікамі, улічваліся пры вызначэнні ім жалавання. Калі ж у загадзе было пазначана шмат спраў, з якіх можна было «карміцца», то чыноўнікам плацілі меншае жалаванне.

Апроч вышэйзгаданых формаў праявы карупцыі ў раннефеадальнай Русі, было распаўсюджана так званае *кармленне* княжых мужоў. Стаўленікі князя прывыкалі да той думкі, што маюць права карміцца за кошт іншага чалавека, а гэты чалавек, у сваю чаргу, павінен служыць княжым мужам. «Кармленне» перарасло ў *«ліхаімства»*, што мела ў аснове атрыманне службовай асобай судовых органаў дазволеных законам пошлін звыш нормы, устаноўленай у законе [3, с. 231]. Сутнасць кармлення заключалася ў тым, што службовая асоба і падпарадкаваны яму апарат кіравання казённага жалавання не атрымлівалі, а прымалі на свой рахунак толькі добраахвотныя дары ад насельніцтва. Такая форма хабарніцтва была абсалютна легальнай, і княжыя мужы на законных падставах бралі з просьбітаў не толькі грошы. Справаздачныя ведамасці ўтрымліваюць згадкі пра такія прадукты, як мёд, мяса, рыба, проса і іншыя. «Кармленне» было адменена ў Маскоўскай дзяржаве ў сярэдзіне XVI ст., аднак

цалкам выкараніць яго не ўдалося. Даходы і выдаткі казны Старажытнарускай дзяржавы не дазвалялі рэгулярна выплачваць грашовае ўтрыманне службовай асобе. Рэанімавалі сістэму «кармлення» ў часы Расійскай Імперыі нерэгулярныя выплаты акладаў чыноўнікам і губернатарам. Да сярэдзіны XVIII ст. сярод жыхароў губерняў існаваў звычай «карміць сваіх чыноўнікаў» у чатыры вялікія святы: Каляды, Масленіца, Вялікдзень і Пятроў дзень. Паборы з насельніцтва вызначаліся звычаем, а адхіленне ад «нормы» магло справакаваць народнае хваляванне аж да паўстання супраць прадстаўнікоў улады [4, с. 178].

У перыяд IX–XIII стст. на Кіеўскай Русі ўсталявалася практыка заступніцтва княжацкай улады ў адносінах да насельніцтва той мясцовасці, дзе князь меў «княскі стол». Праз развіццё дзяржаўнасці сфарміраваліся «кормленыя акругі», якімі кіравалі ваяводы, прызначаныя князямі. З боку князёў прысутнічала неабходнасць выдачы статутных грамат (ваяводам) для папярэджання магчымых злоўжыванняў. У граматах змяшчаліся звесткі аб памерах «кармоў» і пошлін, якія спаганяліся з насельніцтва. Аднак збор сумы вышэй, чым указаная ў грамаце ў якасці падатку, лічыўся парушэннем. Ваявода быў абмежаваны толькі ў перавышэнні памераў збораў, астатнія паўнамоцтвы не звужаліся: паўната судовай і выканаўчай улады была ў яго руках [5, с. 384].

Неабходна адзначыць, што службовыя асобы ў Старажытнарускай дзяржаве патрабавалі даход у выглядзе судовых пошлін і ў тым самым «корме». Крымінальныя штрафы — віры і продажы — накіроўваліся князю, паколькі паступленні ў дзяржаўную казну і асабісты даход князя не размяжоўваўся, аднак, нягледзячы на гэта, памочнікі князя ўсё ж мелі асаблівы даход. Былі ўстаноўлены памеры гэтых даходаў на карысць некаторых займаемых памочнікамі пасад. Так, вірнік (зборшчык віры, штрафу за забойства вольнага чалавека) з простай віры атрымліваў 8 грыўняў, а мяцельнік (прадстаўнік мясцовай абшчыны, які ўдзельнічае ў зборы віры) — 12 вячош; «отрак» (малодшы член княжацкага адміністрацыйнага апарата) з продажу (штраф за маёмасныя злачынствы) у 12 грыўняў — 2 грыўні 20 кун. Гэтак жа даходы запатрабаваліся такім шляхам з суда пасаднікамі і цівунамі [6, с. 140]. Суддзя і выканаўчыя пры судзе органы атрымлівалі ад мясцовага насельніцтва неабходныя прадукты харчавання як для сябе саміх, так і для слуг і нават для коней. Гэта быў так званы корм. Кароткая Руская Праўда адзначала наступнае: «А от гривни (а) мечникоу коуна, а в десятиноу 15 коунъ, а князю 3 гривны; а от 12 гривноу емъцю 70 коунъ, а в десятину 2 гривне, а князю 10 гривенъ» (арт. 41) [7]. Артыкул усталёўваў нормы прыбыткаў самога князя, службовых асоб княжацкага суда і хрысціянскай царквы ад продажаў. Чытанне «а от гривны» лічаць сапсаваным і замяняюць чытаннем: «а от 3 гривен». Такім чынам, артыкул у двух сваіх частках паказвае, каму колькі ішло ад тыповых продажаў: у 3 грыўны і

ў 12 грыўняў [8, с. 53–54]. Спасаб утрымання службовых асоб, які заключаўся ў прадастаўленні ім «корму», з цягам часу стаў насіць «прыватны» характар і разглядаўся кандыдатамі ў першую чаргу як сродак пражытку, а не сур'ёзнае становішча на дзяржаўным узроўні, што мела на ўвазе адказнасць за сваю пасаду.

З трох відаў «карыслівых даходаў» уладамі прызнаваліся законнымі грашовыя і натуральныя дары чыноўнікам да пачатку справы і дары пасля заканчэння справы, аднак строга каралася прыняцце чыноўнікам дароў пад назвай «абяцанне», якія заўсёды былі звязаныя з парушэннем закона, таму разглядаліся як «дрэнныя даходы».

На справе намеснікі і ваяводы на месцах, маючы вялікія паўнамоцтвы, не атрымлівалі належнага грашовага заахвочвання з дзяржаўнай казны, што прыводзіла да злоўжыванняў сваім становішчам.

У часы мангола-татарскага іга ў паўночна-усходняй Русі (1242 г. – канец XV ст.) рускія князі былі падуладныя мангола-татарскім ханам і іх намеснікам — баскакам; добразычлівасць заступнікаў уплывала на атрыманне ў сталіцы Залатой Арды імі граматы на княжанне (ярлыка). Без дароў хану і чыноўнікам правядзенне такога мерапрыемства было неэфектыўным. Дарункі такога роду з'яўляліся хабарам, а такая практыка для дадзенага этапу была звычайнай, як і для перыяду існавання Кіеўскай Русі [9].

Падводзячы вынік вышэйсказанаму, адзначым, што галоўнай прычынай учынення карупцыйных злачынстваў прадстаўнікамі ўлады ў Кіеўскай Русі была ўсёдазволенасць, якая не мела вызначаных межаў і не рэгулявалася на той час актамі заканадаўства. Нягледзячы на тое, што памеры дазволеных збораў былі прадугледжаны ў граматах, парушэнне дадзеных палажэнняў асобамі, якія займалі пасады, не цягнула за сабой ніякай адказнасці. Процідзеянне карупцыі праходзіла на інтуітыўным узроўні: насельніцтва разумела неадэкватнасць «пабораў» і імкнулася самастойна прадухіліць здзяйсненне чарговага карупцыйнага злачынства.

1. Лаврентьевская летопись. 1377 г. [Электронный ресурс] // Российская национальная библиотека (РНБ). Ф. 550. Л. 14 Об. URL: https://expositions.nlr.ru/LaurentianCodex/_Project/page_Show.php?list=34&n=42 (дата обращения: 09.03.2025). Перейти к источнику Вернуться к статье

2. Сафонов А. И., Бурак Я. А. Исторические предпосылки возникновения коррупции на территории Беларуси // Наука — образованию, производству, экономике : материалы 74-й Регион. науч.-практ. конф. преподавателей, науч. сотрудников и аспирантов, Витебск, 18 февр. 2022 г. / Витеб. гос. ун-т ; редкол.: Е. Я. Аршанский (гл. ред.) [и др.]. Витебск, 2022. С. 392–393. Вернуться к статье

3. Гридякин Д. А. Коррупция в государственном механизме современной России // Науч. ведомости. 2009. № 7 (62). С. 230–235. Вернуться к статье

4. Касьянов В. С. Исторические аспекты противодействия коррупции в России // Государственное и муниципальное управление. Ученые зап. СКАГС. 2012. № 2. С. 177–187. Вернуться к статье

5. Российское законодательство X–XX веков : в 9 т. / под общ. ред. О. И. Чистякова. М. : Юрид. лит., 1986. Т. 4 : Законодательство периода становления абсолютизма / отв. ред. А. Г. Маньков. 511 с. Вернуться к статье

6. Дьяконов М. А. Очерки общественного и государственного строя Древней Руси : справоч. пособие для ВУЗов ; предисл. М. Н. Покровского. 4-е изд., испр. и доп. М. ; Л. : Гос. изд-во, 1926. 402 с. Вернуться к статье

7. Краткая Русская Правда (по Академическому списку половины XV в.) [Электронный ресурс] // Ист. фак. Моск. гос. ун-та им. М. В. Ломоносова : [сайт]. URL: https://www.hist.msu.ru/ER/Etext/RP/krp.htm (дата обращения: 22.01.2025). Перейти к источнику Вернуться к статье

8. Правда русская : учеб. пособие / утв. Всесоюз. Ком. по делам высш. шк. при СНК СССР в качестве учеб. пособия для ист. фак., ун-тов и пед. ин-тов ; подгот. к изд. Н. Ф. Лавровым ; отв. ред. акад. Б. Д. Греков. М. ; Л. : Изд-во Акад. наук СССР, 1940. 112 с. Вернуться к статье

9. История государства Российского : в 12 т. / соч. Н. М. Карамзина ; отв. ред. А. Н. Сахаров. М. : Наука, 1989. Кн. 2 (т. 5–8) : История государства Российского / соч. Н. М. Карамзина ; отв. ред. А. Н. Сахаров. 560 с. Вернуться к статье